Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 студзеня 2014 г. СУБОТА № 14 (27624) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫ ФУНДАМЕНТ ДЗЯРЖАВЫ

Віншаванне Прэзідэнта з Днём беларускай навукі і 85-годдзем Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Дарагія сябры!

Сардэчна віншую вас з Днём беларускай навукі і 85-годдзем Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Навука стварае надзейны інтэлектуальны фундамент беларускай дзяржавы, вызначае шляхі нашага руху наперад. Імёны і дасягненні выдатных вучоных з'яўляюцца прадметам гонару ўсяго народа.

Вядучую ролю ў гэтай сферы адыгрывае яе флагман — Нацыянальная акадэмія навук, якая за гады сваёй гісторыі ператварылася ў буйнейшы даследчы цэнтр краіны, што вырашае не толькі фундаментальныя, але і прыкладныя праблемы, карыстаецца аўтарытэтам у свеце.

Сёння беларускай навуцы неабходна выйсці на перадавыя пазіцыі ў стратэгічных напрамках інавацыйнага развіцця, умацаваць сувязь даследаванняў і распрацовак з пільнымі патрэбамі эканомікі і забяспечыць укараненне іх вынікаў у практыку. Упэўнены, што нашы вучоныя паспяхова справяцца з гэтымі важнымі і адказнымі задачамі.

Жадаю вам здароўя, натхнення, поспехаў у навуковай і педагагічнай дзейнасці, шчасця і дабрабыту.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

АЙЧЫННАЯ НАВУКА: ПЕРАДАВЫЯ ПАЗІЦЫІ — ПА РОЗНЫХ НАПРАМКАХ

Галоўным крытэрыем эфектыўнасці работы вучоных з'яўляецца ўплыў яе вынікаў на рост айчыннай эканомікі, заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, уручаючы ўчора дыпломы доктара навук і атэстаты прафесара навуковым і навукова-педагагічным работнікам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка ўручае дыплом доктара філалагічных навук Жанне Некрашэвіч-Кароткай.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што мінулы год стаў вельмі важным для айчыннай навукі. «Нямала коп'яў было зламана вакол таго, па якім шляху павінна развівацца навуковая сфера краіны і яе флагман — Акадэмія навук», — сказаў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што пачынаючы пераўтварэнні, у краіне зыходзілі з таго, што перадавая навука не толькі пытанне прэстыжу, але і адзін з гарантаў нацыянальнай бяспекі дзяржавы. «Тут вельмі важна не сячы з-за пляча, а абавязкова зберагчы моцную акадэмію і іншыя навуковыя цэнтры як крыніцы інтэлектуальнай энергіі, адкуль можна чэрпаць наватарскія ідэі для паспяховага развіцця краіны», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў краіне пастараліся пазбегнуць радыкальных крайнасцяў і абапіраліся на меркаванні вучоных. Пры іх актыўным удзеле распрацавана комплексная Праграма ўдасканалення навуковай сферы Беларусі, разлічаная на паэтапную мадэрнізацыю. Паводле слоў Прэзідэнта, яе рэалізацыя дасць магчымасць прывесці арганізацыйную структуру навуковай галіны ў адпаведнасць з патрэбнасцямі сучаснай Беларусі, забяспечыць прыярытэтнае правядзенне прарыўных даследаванняў, арыентаваных на інавацыйныя вытворчасці і развіццё сучасных інфармацыйных, авіякасмічных, хімічных, біялагічных, машынабудаўнічых і сельскагаспадарчых тэхналогій.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што беларускія даследчыкі прымуць самы актыўны ўдзел у яе рэалізацыі. Паводле слоў Прэзідэнта, Беларусі ўдалося закрыць дарогу ў навуку аўтарам слабых і кампілятыўных работ, пазбегнуць скандалаў з плагіятам, якія ўзрушваюць многія дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў свой час у краіне настаялі на захаванні дзяржаўнай сістэмы прысваення вучоных ступеняў і званняў. «Дыплом доктара і атэстат прафесара ў Беларусі — гэта сведчанне сапраўды высокай навуковай кваліфікацыі, яны прызнаюцца ва ўсім свеце», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Разам з тым, Прэзідэнт лічыць, што неабходна павысіць эфектыўнасць сістэмы падрыхтоўкі кадраў, пачынаючы з работы магістратуры і аспірантуры. Аляксандр Лукашэнка ўручыў дыпломы доктара аўтарам фундаментальных работ і прарыўных даследаванняў у галіне прыродазнаўчых, прыкладных і гуманітарных навук.

■ Факт і каментарый

ХІБА ГЭТА ІПАТЭКА?

Днямі банкаўская супольнасць узрадавала нас з вамі прыемнай навіной: пасля доўгага перапынку ў беларусаў зноў з'явілася магчымасць куплі жылля ў крэдыт. Першым камерцыйным банкам, які аднавіў свае праграмы фінансавання нерухомасці, стаў Белгазпрамбанк.

Нагадаю, што да апошняга часу падобныя праграмы дзейнічалі толькі ў Беларусбанку і Белагрупрамбанку, дзе задзейнічаны ў тым ліку і дзяржаўныя грошы. Праўда, па іх праграмах можна ўзяць крэдыт толькі на будаўніцтва кватэры. А пазычаць сродкі пад набыццё прыватнай нерухомасці — гэта ўжо цалкам камерцыйная здзелка. Цяпер Белгазпрамбанк прапануе сваім кліентам доўгатэрміновыя крэдыты на ўмовах іпатэкі. Тут маецца на ўвазе тое, што забеспячэннем па крэдыце выступае сам аб'ект нерухомасці — вы прапануеце яго пад заклад выдадзеных грошай. Разам з тым, умовы іпатэчнага крэдытавання ў нашай першай «ластаўкі» не зусім «ласкавыя».

СТАР. 2

ЯК ПТУШКА ФЕНІКС

ШЛЯХАМІ ВЫЗВАЛЕННЯ

Лельчыцкі раён, адзін з двух у Беларусі, цалкам знішчаных фашыстамі, адраджаўся літаральна на папялішчы

За свой век былы франтавік Андрэй ГРЫЦКЕВІЧ пабудаваў дзве хаты. Злева — тая, якую ўзвёў адразу пасля вайны. Сёння ветэран жыве ў сваім навейшым доме (справа).

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Канец другога зімняга месяца — асаблівы час для жыхароў Лельчыцкага краю. 23 студзеня яны адзначылі 70-годдзе вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэтую радасную навіну паведамілі сем дзесяцігоддзяў таму зводка Саўінфармбюро. У той жа дзень гітлераўцы былі выгнаны з найбліжэйшых вёсак. Астатнія населеныя пункты пазбаўляліся варожых кайданоў яшчэ больш за месяц. Толькі гэтых радасных хвілін ляльчанам прыйшлося чакаць ажно тры з паловай гады. З самых першых дзён, калі да іх прыйшло ўсведамленне страшнай рэальнасці — пачалася вайна...

СТАР. 4

ТАРЫФЫ ЖКГ БУДУЦЬ СКРУПУЛЁЗНА ПРААНАЛІЗАВАНЫ

Жыллёва-камунальную гаспадарку Беларусі чакаюць сур'ёзныя пераўтварэнні. Пра гэта заявіў учора на выніковым пасяджэнні калегіі Міністэрства ЖКГ намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Анатоль КАЛІНІН.

Зараз ствараецца камісія на чале са **старшынёй Камітэта дзяржкантролю Аляксандрам Якабсонам,** якая прааналізуе працу арганізацый жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Мяркуецца, што яна дэталёва вывучыць праблемныя пытанні ЖКГ для выпрацоўкі і рэалізацыі мер, накіраваных на істотнае паляпшэнне становішча спраў у гэтай сферы. Адным з асноўных кірункаў работы камісіі, як заявіў **міністр ЖКГ Андрэй Шорац**, будзе аналіз тарыфаў і, адпаведна, тых выдаткаў, якія ў іх уключаны.

Анатолем Калініным на пасяджэнні калегіі была пастаўлена задача забяспечыць у 2014 годзе комплексным абслугоўваннем да 50% жыллёвага фонду Беларусі. Пры гэтым у Мінску плануецца перавесці на комплекснае абслугоўванне да 80% жылога фонду. Акрамя таго, намеснік прэм'ер-міністра лічыць неабходным стварыць у сістэме ЖКГ асобную структуру па кіраванні маёмасным комплексам. «Яна будзе працаваць па актах выкананых работ, аказваючы паслугі па прыбіранні вуліц ад снегу, утрыманні тых ці іншых інжынерных сетак, будынкаў, збудаванняў. Праца будзе весціся па планава-разліковых цэнах. Гэта ўвойдзе ў асобны радок выдаткаў на ўтрыманне», — сказаў Анатоль Калінін.

Святлана БУСЬКО.

ДАРЭЧЫ

За мінулы год у арганізацыі ЖКГ паступіла звыш 94 тысяч зваротаў ад грамадзян і юрыдычных асоб. Зроблена больш за 11 тысяч запісаў у «Кнігі заўваг і прапаноў». У параўнанні з 2012 годам агульная колькасць зваротаў зменшылася на 8%. Аднак колькасць паўторных павялічылася на 25%. Асноўнымі прычынамі па-ранейшаму з'яўляецца нізкая якасць паслуг, невыкананне тэрмінаў правядзення бягучага і капітальнага рамонту, фармалізм і валакіта пры разглядзе зваротаў, а таксама недастатковы кантроль за выкананнем абяцанняў кіраўнікоў.

Карысна ведаць

Пры мінус 15 градусах спецыялісты ЖКГ, адказныя асобы, якія забяспечваюць гатоўнасць ацяпляльных сістэм, трубаправодаў і іншага абсталявання, павінны дзяжурыць кругласутачна.

МНС заклікае да павышанай асцярожнасці ў сувязі з моцнымі маразамі

ЦЫТАТА ДНЯ

Пётр ПРАКАПОВІЧ, намеснік прэм'ер-міністра:

«Малы і сярэдні бізнес развіваецца ў Беларусі дастаткова дынамічна. Намечаныя планы па яго развіцці выконваюцца. Уклад прадпрымальніцкага сектара ў ВРП склаў па выніках 2013 года каля 24%. Прадпрымальнікі стварылі некалькі дзясяткаў тысяч працоўных месцаў. Мы павінны імкнуцца ў бліжэйшыя гады дасягнуць укладу прадпрымальніцкага сектара ў эканоміку краіны на ўзроўні развітых еўрапейскіх дзяржаў — 60-70%. Нам трэба стварыць неабходныя ўмовы, каб гэтыя планы рэальна ажыццявіць. Патэнцыял для гэтага ў Беларусі ёсць, і нядрэнны».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.01.2014 г.

Долар ЗША	9600,00	▲
Еўра	13140,00	▲
Рас. руб.	280,00	▼
Укр. грыўня	1138,11	▲

■ Курсавая розніца

Еўра расце, расійскі рубель падае

Негатыўная эканамічная статыстыка з «сусветных лакаматываў» Кітая і ЗША прымусіла на гэтым тыдні адступіць усе валюты краін, якія развіваюцца. «Расіяніна» не падтрымала і цана на нафту.

Зніжэнне расійскага рубля амаль да ўзроўню 2009 года выклікала занепакоенасць з боку насельніцтва і бізнесу. Аднак аналітыкі сцвярджаюць, што рубель яшчэ адыграе свае пазіцыі. Расійскі Цэнтрабанк наўмысна адмовіўся ад валютных інтэрвенцый для падтрымкі курсу нацыянальнай валюты. Гэтыя дзеянні дазваляюць пазбавіцца ад залішніх выдаткаў золатавалютных рэзерваў, дапамагчы экспарцёрам і падтрымаць даходы бюджэту, што вельмі важна ва ўмовах замаруджвання тэмпаў росту расійскай эканомікі.

У той жа час пра еўра многія эксперты (у тым ліку і еўрапейскія) кажуць наступнае: «...такі вялікі і інтэнсіўны рост курсу можа пераўтварыцца ў катастрафічна рэзкае падзенне...». Незадаволенасць насельніцтва высокімі падаткамі ў межах жорсткіх захадаў Цэнтрабанка можа выклікаць неспадзяваныя палітычныя рашэнні — напрыклад, выхад Францыі з еўразоны.

На нашым рынку таксама адлюстраваны сусветныя тэндэнцыі. Долар падаражэў яшчэ на 30 рублёў (плюс 0,3%) да 9600. Еўра «падскочыў» адразу на 120 (плюс 0,9%) да 13140. Расійскі рубель згубіў 6 (мінус 2,1%) да 280.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

МУС УКРАІНЫ ЗАКЛІКАЕ НЕ ДАПУСЦІЦЬ НОВЫХ ЧАЛАВЕЧЫХ АХВЯР

МУС Украіны мае інфармацыю пра падрыхтоўку ўзброенай правакацыі, у выніку якой могуць з'явіцца новыя ахвяры, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на Упраўленне сувязяў з грамадскасцю ведамства. МУС краіны заклікае радыкальна настроеных грамадзян не звяртацца да экстрэмісцкіх дзеянняў, накіраваных на развязванне грамадзянскай вайны, і спыніць ахвяраваць чалавечымі жыццямі. У той жа час не сцішаюць пратэсты ў рэгіёнах Украіны. Прыхільнікамі апазіцыі захоплены адміністрацыйныя будынкі ў Львове, Цярнопалі, Роўна, Кіеве. У Адэсе пад сценамі мэрыі прыхільнікі ўлады сабраліся на акцыю за больш хуткае мірнае ўрэгуляванне канфлікту ў сталіцы і асобных рэгіёнах. У той жа час адзін з мясцовых тэлеканалаў перадаваў бягучы радок пра тое, што з Кіева прыбылі баевікі апазіцыі, якія маюць намер ажыццявіць сілавы захоп Адэскай аблдзяржадміністрацыі.

СЯДЗЯЧАЯ ПРАЦА ПРАВАКУЕ РАЗВІЦЦЁ ХВАРОБЫ СЭРЦА



Калі мужчына доўгі час сядзіць, то ў яго павышаецца рызыка сардэчнай недастатковасці, нават нягледзячы на наяўнасць рэгулярных трэніровак у штотыднёвым раскладзе, піша Health India. Каб прааналізаваць выяўленую сувязь, даследчыкі прасачылі за групай з 84170 мужчын 45-69 гадоў без сардэчнай недастатковасці. Прыкладна праз 8 гадоў высветлілася: мужчыны з нізкімі паказчыкамі фізічнай актыўнасці на 52% мелі вышэйшую рызыку сардэчнай недастатковасці, чым мужчыны з высокімі паказчыкамі фізічнай актыўнасці, нават калі была ўлічана колькасць гадзін, праведзеных на крэсле або канапе. Мужчыны, якія сядзелі па 5 гадзін, з недастатковасцю маглі сутыкнуцца на 34% часцей за тых, хто сядзеў у дзень не больш за 2 гадзіны. І трэніроўкі тут не ратавалі. Рызыка падскаквала больш чым у 2 разы ў мужчын, якія сядзелі мінімум 5 гадзін і мала трэніраваліся. Каб скараціць рызыку сардэчнай недастатковасці, варта як мінімум 150 хвілін на тыдзень выдаткоўваць на аэробныя нагрузкі сярэдняй інтэнсіўнасці.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ЦРУ ЗАПЛАЦІЛА 15 МЛН ДОЛАРАЎ ЗА СТВАРЭННЕ САКРЭТНАЙ ТУРМЫ Ў ПОЛЬШЧЫ?

У ЗША сталі вядомыя новыя падрабязнасці скандальнай гісторыі з сакрэтнай турмой Цэнтральнага разведвальнага ўпраўлення на паўночным усходзе Польшчы. Як сцвярджае газета The Washington Post, ЦРУ заплаціла 15 мільёнаў долараў наяўнымі за стварэнне гэтай турмы для падазраваных у тэрарызме.

Дзве вялікія кардонныя скрынкі з грашыма ў пачатку 2003 года былі дастаўлены ў Варшаву дыпламатычнай поштай з Германіі. Як паведамлялася раней, ЦРУ пасля тэрактаў 11 верасня 2001 года арандавала вілу, якая належала польскай разведцы, у вёсцы Старэ-Кейкуты. Паводле звестак СМІ, сакрэтная турма, дзе зняволеных катавалі, была закрыта ў верасні 2003 года, а вязняў пад вартай перавялі на аналагічныя аб'екты ЦРУ ў Румыніі і Марока.

У 2007 годзе камісія ЕС прызнала, што сакрэтныя турмы ЦРУ існавалі ў Італіі і Польшчы. Тады спецыяльная камісія выявіла 14 дзяржаў Еўропы, якія дапамагалі амерыканцам праводзіць следчыя мерапрыемствы і ствараць сакрэтныя турмы, існаванне якіх супярэчыць Жэнеўскай канвенцыі.

КОРАТКА

У Беларусі 47,1 тыс. малых ва ўзросце да двух гадоў былі забяспечаны бясплатным дзіцячым харчаваннем у 2013 годзе. Фінансаванне на гэтыя мэты склала Br157,9 млрд.

У Беларусі ў 2013 годзе колькасць абанентаў сотавай рухомай электрасувязі павялічылася на 438 тыс. і на 1 студзеня 2014 года склала 11,1 млн. Цяпер сотавай рухомай электрасувяззю ахоплена 98,4 працэнта тэрыторыі рэспублікі, на якой пражывае 99,9 працэнта насельніцтва.

У Мінску стаўкі адзінага падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў плануецца павысіць на 14-18 працэнтаў.

На матчы маючага адбыцца чэмпіянату свету па хакеі 2014 года застаецца даступным у продажы шэраг білетаў, рэалізацыю якіх працягвае білетны аператар турніру — ТАА «Тыкетпро». У гэтым спісе няма матчаў з удзелам зборнай Беларусі.

■ Са святам, студыёзусы!

БЫЛІ РАМАНТЫКАМІ — СТАЛІ ПРАГМАТЫКАМІ?

Студэнт нічога не забывае — ён проста не засмечвае сваю памяць залішняй інфармацыяй. Студэнт не чэша патыліцу, а абдумвае рашэнне. Студэнт не крычыць — ён адстойвае сваю пазіцыю. Студэнт не памыляецца, а прымае рызыкоўнае рашэнне. Студэнт не спазняецца на лекцыю, а затрымліваецца па важных справах...Сёння, у Таццянін дзень, нават самыя «барадатыя» студэнцкія анекдоты і байкі пойдуць на «ўра» і нават суровыя выкладчыкі ўсміхнуцца чарговай порцыі студэнцкага гумару. Што ні кажы, а моладзі на прасторах былога Саюза сур'ёзна пашанцавала: Дзень студэнта яны адзначаюць двойчы на год — 17 лістапада і 25 студзеня. Экзаменацыйная сесія здадзена — і наперадзе два тыдні зімовых канікулаў. А пакуль студэнты адпачываюць і адзначаюць студэнцкае свята, мы вырашылі пацікавіцца ў кіраўнікоў вышэйшых навучальных устаноў іх меркаваннямі наконт сучаснай моладзі. Сённяшні студэнт — які ён? Ці ёсць розніца паміж студэнтамі XX і XXI стагоддзя? Ці ўжываюць маладыя людзі падчас здачы сесіі розныя хітрыкі? А можа, папяровыя шпаргалкі паспелі ўжо стаць архаізмам?



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СТАР. 2